Радзіма… Колькі сэнсу ў адным слове! І адразу памяць падказвае: род, родны, народ, нараджэнне, адраджэнне… І адразу прыходзіць да цябе яшчэ адно слова – Беларусь.

Беларусь… Край сінявокіх азёр і буйных дубраў, сівых паданняў і сучасных пабудоў, мілагучных песень і змястоўных прыказак. Краіна з цікавай шматгадовай гісторыяй, дзе жывуць таленавітыя, зычлівыя людзі.

І дзе б мы з вамі ні былі, куды б ні ад'язджалі, мы заўсёды памятаем пра родныя мясціны. А яшчэ нам заўсёды хочацца вярнуцца туды, дзе пачынаўся наш жыццёвы шлях. Бо з нашай малой радзімы (з кустоў бэзу ля роднай хаты, з невялікай ціхай рачулкі, са сцяжынкі, знаемай з дзяцінства) пачынаецца вялікая краіна – наша Беларусь.

Нельга марыць пра будучыню краіны, калі не ведаеш таго, чым яна жыве сення, і таго, што было яе жыццем ўчора.

Таму варта адправіцца ў незвычайнае і цікавае падарожжа па родным краі, каб пашырыць свае веды пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі і яе сучаснасць.

## ГОДУ МАЛОЙ РАДЗІМЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА
## Квэст-гульня для 9 - 11 класаў
## «Падарожжа па родным краі»

*Да роднай зямлі я*
*Душою і сэрцам прыкуты,*
*Куваюць зязюлі,*
*Клякочуць буслы на маёй Беларусі.*
*Ты радасць мая, Беларусь.*
*Ты гора маё і пакута,*
*І ад цябе я ніколі*
*Не адцураюся,*
*Не адракуся!*
*Пімен Панчанка*

**Мэта:**

пашырыць веды вучняў пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі і яе сучаснасць;

выхоўваць пачуццё гонару і глыбокай павагі да нацыянальных традыцый, звычаяў, культуры роднага краю.

***Бібліятэкар:***

Добры дзень, паважаныя ўдзельнікі нашага падарожжа, госці, члены журы. Сёння я запрашаю вас прыняць удзел у тэматычнай квэст-гульні. Нас чакае захапляючае падарожжа па нашай неабсяжнай Радзіме. На кожным прыпынку вы не толькі будзеце адказываць на пытанні, але і даведаецеся шмат цікавага і новага.

Калі ўсе гатовы да падарожжа, я прапаную атрымаць маршрутныя лісты і адправіцца ў вандроўку.

**1 станцыя -"Сімвалічная"**

Беларускі народ за доўгія гады свайго існавання стварыў шмат сімвалаў, якія штораз усплываюць перад вачыма кожнага, хто чуе словы «Беларусь», «беларусы».

Слова "сімвал" утворана ад грэчаскага "*symbolon",* што ў перакладзе на беларускую мову азначае *знак, апазнавальная прыкмета.*

На гэтым прыпынку ўдзельнікам падарожжа неабходна адказаць на пытанні, якія датычацца сімвалаў нашай краіны.

1. Кожная незалежная дзяржава мае свае сімвалы. Якія сімвалы мае наша краіна? (*Герб, сцяг, гімн*)
2. Колькі колераў мае Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, што яны сімвалізуюць? (*Тры колеры. Чырвоны – колер сонца, сімвал братэрства, барацьбы за справядлівую справу. Зялены – колер жыцця, міру, дастатку, надзеі і адраджэння. Белы – колер свабоды, маральный чысціні, мудрасці. Арнамент – сімвал старажытнай культуры, духоўнага багацця нацыі).*
3. Што можна ўбачыць на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь*? (Вянок з каласоў, пераплецены кветкамі канюшыны і лёну – сімвал памяці і сувязі з продкамі; канюшына – сувязь са светам жывел; лён – сімвал працы, знак дабра і дастатку. Зямны шар у залатых праменнях – знак, што Беларусь ставіцца да ўсіх народаў, як да сяброў. Зямля і сонца – знак жыцця. Чырвоная зорка – знак мужнасці).*
4. Вянок з каласоў перавіты чырвона-зялёнай стужкай. Які надпіс зроблены на ёй? *(Рэспубліка Беларусь – літарамі залатога колеру).*
5. Успомніце, якімі радкамі пачынаецца Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь?
*(Мы беларусы – мірныя людзі,*
*Сэрцам адданыя роднай зямлі…).*
6. Што з'яўляецца Асноўным Законам Рэспублікі Беларусь? *(Канстытуцыя).*
7. Гэта свята сімвалізуе еднасць народа і дзяржавы, нашу самабытнасць. Адзначаецца ў дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. *(Дзень Незалежнасці. 3 ліпеня).*
8. Якая птушка з'яўляецца сімвалам нашай краіны? І чаму менавіта яна? *(Бусел. Павер'е сцвярджае, што бусел прыносіць у дом удачу, дзяцей і шчасце).*
9. Самы вядомы сімвал Беларусі, занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. *(Зубр)*
10. Што з'яўляецца прыродным сімвалам Рэспублікі Беларусь? *(Лён – нацыянальнае багацце Беларусі. Блакітны колер вачэй беларусаў асацыіруецца з блакітнымі кветкамі лёну, лён – гэта ўвасабленне беларусак, такіх жа чыстых і пяшчотных, як белае льняное палатно).*

**2 станцыя - "Гістарычная"**

Чалавек, які не ведае гісторыю сваёй краіны, не зможа зразумець яе сучаснасць. Таму на гэтым прыпынку мы з вамі паспрабуем успомніць, што мы ведаем пра гісторыю нашай краіны.

1. У выніку якой аперацыі Другой сусветнай вайны была вызвалена тэрыторыя Беларусі? *(Баграціён).*

2. Гэты город некалі быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага. *(Навагрудак).*

3. Гэты чалавеку 1512 годзе ў Падунскім універсітэце першым сярод усходніх славян атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны, але вядомасць яму прынесла не лекарства, а.... *(Кніга (Біблія), Ф. Скарына).*

4. Славутая Еўфрасіння Полацкая была дачкой князя Святаслава. Як гучала яе поўнае імя з імем па бацьку? *(Прадслава Святаслаўна).*

5. Назавіце імя нашай славутай суайчынніцы – полацкай князёўны, якая прыняла хрысціянства і была першай жанчынай-манахіняй у Старажытнай Русі. *(Рагнеда).*

6. Назавіце імя асветніка XII стагоддзя, прылучанага да ліку святых, які спачатку быў манахам-пустэльнікам, а потым епіскапам. Сучаснікі далі яму імя Златавуста. *(Кірыла Тураўскі).*

7. Князь, які аб'яднаў пад сваёй уладай землі Навагрудчыны, Чорнай Русі, усходнія землі Летувы і частку Полаччыны ў адну дзяржаву, які быў заснавальнікам Вялікага Княства Літоўскага. *(Міндоўг).*

8. Мастак, выкарыстоўваў тэхніку алоўкавага малюнка, маляваў памятныя мясціны і шэдэўры дойлідства.Ямупастаўлены помнік у Брэсцкай вобласці. *(Напалеон Орда).*

9. Назавіце імя святой апякункі Беларусі, першай жанчыны, кананізаванай Рускай праваслаўнай царквой.*(Еўфрасіння Полацкая).*

10. Скончыце фразу: “Рагнеда – гэта дачка першага полацкага князя, а самога княза звалі…” *(Рагвалод).*

**3 станцыя - “Геаграфічная”**

Калі мы ўважліва прыгледзімся да карты Беларусі, то ўбачым, што яна падобна на кляновы лісток. На поўдні гэтата лістка на сотні кіламетраў цягнуцца лясы і балоты, парослыя ярка-зялёнай цінай, трыснягом і асакой. На поўначы між вялікіх хваль узгоркаў зіхацяць люстэркі азёр. Густыя лясы, зялёныя сенажаці, дарогі сярод хрыбтоў, блакітныя палі лёну, ціхія і спакойныя рэкі…

1. Назавіце самае вялікае возера Беларусі. *(Нарач).*

2. На якой рацэ стаіць горад Гродна? *(Нёман).*

3. З якімі краінамі мяжуе Рэспубліка Беларусь? *(Літва, Латвія, Польшча, Украіна, Расія).*

4. Назавіце самую вялікую раку Беларусі. *(Днепр).*

5. Самы вялікі город Беларусі – Мінск, а самы старажытны - … Назавіцце, калі ласка. *(Полацк).*

6. Якія гарады нашай краіны носяць ганаровае званне “Горад-герой”? *(Мінск, Брэст).*

7. Назавіце вобласць Беларусі, якая мяжуе з трыма дзяржавамі. *(Віцебская – Літва, Латвія, Расія).*
8. У творы У. Караткевіча іх называлі “Божыя сады”. Назавіце самы стары з іх на тэрыторыі Беларусі. *(Белавежская пушча).*
9. Чаму горад Гродна носіць такую назву? *(Раней горад называўся Гародзень, што азначае “агароджанае месца”).*
10. Беларусь сінявокая… Чаму так гавораць? *(Шмат азёр).* Назавіце самае вялікае возера на Навагрудчыне. *(Свіцязь).*

**4 станцыя - “Архітэктурная”**

Беларусь размешчана ў цэнтры Еўропы, на перакрыжаванні вялікіх вадных шляхоў з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход, на стыку Захаду і Усходу, заходняй і ўсходняй культур. Мяжуючы з намі, апошнія, здавалася б, павінны былі рабіць свой уплыў на мясцовую беларускую культуру. Але, нягледзячы на складаную гісторыю, поўную войнаў і разбурэнняў, многія архітэктурныя каштоўнасці Беларусі захаваліся. Найбольш старадаўнія збудаванні ў Беларусі адносяць да Сярэднявечча.

Розныя напрамкі ў мастацтве і рэлігіі паўплывалі на фарміраванне архітэктуры Беларусі. У краіне можна знайсці ўзоры раманскага стылю і готыкі, барока і класіцызму, мадэрна і эклектыкі.

1. Візітная картка Беларусі. Гэта мультыфункцыянальны цэнтр, дзе сумясціліся высокія тэхналогіі, ультрасучасны дызайн і незвычайная архітэктура. *(Нацыянальная бібліятэка Беларусі).*
2. Назавіце мемарыяльны комплекс, усталяваны на месцы спаленай фашыстамі беларускай вёскі. *(Хатынь).*
3. У гонар гераічных дзеянняў у ваеннай аперацыі “Баграціён” быў узведзены ваенны помнік. Назавіце гэты помнік і месца, дзе ён устаноўлены. *(Курган Славы ў Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці).*
4. Гэты замак – помнік сярэднявечнай архітэктуры Беларусі. З 2000 года замак знаходзіцца ў спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. *(Мірскі).*
5. 22 чэрвеня 1941 г. гарнізон гэтай крэпасці прыняў першыя ўдары нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У пасляваенны час цытадэль атрымала ганаровае званне “Крэпасць-герой” *(Брэсцкая крэпасць-герой).*
6. Назавіце вядомыя старажытныя замкі Беларусі. *(Гальшанскі, Крэўскі, Лідскі, Мірскі, Навагрудскі, Нясвіжскі).*
7. Спартыўны комплекс, які ўключае ў сябе спартыўна-відовішчную арэну, канькабежны стадыён, веладром. Дайце назву гэтаму будынку. *(Мінск -Арэна).*
8. Касцёл, які знаходзіцца ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці. Гэтаму шэдэўру Беларусі больш за 100 гадоў, але да гэтай пары ён здзіўляе нас сваёй прыгажосцю і магутнасцю. *(Траецкі касцёл у Гервятах).*
9. Беларусь даўно вядома лядовымі палацамі. Гэты будынак адчыніў свае дзверы напярэдадні Чэмпіяната свету па хакеі. Адрозніваецца сваёй

незвычайнай формай, прыцягвае не толькі турыстаў, але і жыхароў нашай краіны. *(Чыжоўка-Арэна).*

10. Вялікая доля гісторыі Беларусі вяршылася каля сцен гэтых замкаў. Адзін з такіх замкаў знаходзіцца на беразе ракі Нёман. Гэтыя помнікі можна аднесці да аднаго сазнакамітых помнікаў архітэктуры Беларусі. *(Стары і Новы замкі ў Гродне).*

**5 станцыя - "Літаратурная"**

Працу на гэтым прыпынку хочацца пачаць словамі нашых землякоў: Я. Коласа, які казаў: "Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову", і Я. Сіпакова, які лічыў, што "толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам".

1. З пералічаныхбеларуска-польскіх паэтаў і пісьменнікаў назавіце таго, хто з'яўляецца адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і заснавальнікам нацыянальнай драматургіі і тэатра.
- *Ян Баршчэўскі*
- *<u>Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч</u>*
- *Францыск Багушэвіч*

2. Пісьменнік, які ў 1844-1846 г. выдаў свой галоўны твор – празаічны зборнік "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях". *(Ян Баршчэўскі).*

3. Беларуская пісьменніца, аўтар кніг "У вайны не жаночае аблічча", "Апошнія сведкі", "Цынкавыя хлопчыкі", "Чарнобыльская малітва", Нобелеўскі лаўрэат прэміі па літаратуры. *(Святлана Алексіевіч).*

4. Назавіце імя вядомага беларускага пісьменніка, які ўсе свае творы пісаў на беларускай мове, хаця пакінуў Беларусь у 5-ці гадовым узросце і ўсё жыццё правёў за яе межамі. *(Максім Багдановіч).*

5. У Расіі – А. С. Пушкін і М. Ю. Лермантаў, а ў Беларусі? *(Якуб Колас і Янка Купала).*

6. Назавіце сапраўднае імя пісьменніцы, псеўданім якой Цётка. *(Алаіза Пашкевіч).*

7. Сюжэт гэтага твора В. Быкава лёг у аснову мастацкага фільма,у якім расказваецца пра ўцёкі з канцлагера рускага салдата і італьянскай дзяўчыны. *("Альпійская балада").*

8. Прыгодамі яго палескіх рабінзонаў цікавяцца падлеткі. Назавіце творчае імя-псеўданім пісьменніка. *(Янка Маўр).*

9. Гэтага пісьменніка называюць гонарам і сумленнем беларускай літаратуры. Дыяпазон яго твораў шырокі і разнастайны: ад казкі "Нямоглы бацька" да рамана "Дзікае паляванне караля Стаха". *(Уладзімір Караткевіч).*

10. Назавіце імя вялікага беларускага байкапісца. *(Кандрат Крапіва).*

**6 станцыя - "Музычная"**

*"Мы не павінны адмаўляцца ад таго, з чаго мы выраслі: ад прасеянага стагоддзямі і сугучнага з намі сёння нацыянальнага музычнага ладу і ад іншых асаблівасцей нашай народнай музыкі".*
*Уладзімір Мулявін*

1. Назавіце імя яркага выканаўца, кампазітара, стваральніка ансамбля "Песняры". *(Уладзімір Мулявін).*
2. На якім Міжнародным дзіцячым конкурсе першае і другое месцы ў розныя гады заваявалі Ксенія Сітнік і Аляксей Жыгалковіч? *(Дзіцячае "Еўрабачанне - ...").*
3. Кожнае лета ў Віцебску праходзіць Міжнародны фестываль мастацтваў. Як ён называецца? *("Славянскі базар у Віцебску").*
4. Назавіце аўтара вядомага твора-паланэза "Развітанне з Радзімай" *(Міхаіл Клеафас Агінскі).*
5. Хто з беларускіх выканаўцаў увайшоў у дзясятку лепшых на Міжнародным конкурсе "Еўрабачанне – ..."? *(Дзмітрый Калдун).*
6. Назавіце самыя папулярныя вакальна-інструментальныя ансамблі Беларусі. *("Верасы", "Сябры", "Песняры").*
7. Хто з'яўляецца салістамі папулярнага беларускага ВІА "Сябры"? *(Анатоль Ярмоленка, Алеся)*
8. Назавіце сямейны дуэт спевакоў Беларусі. *(Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч).*
9. Назавіце вядомых вам беларускіх кампазітараў. *(Ігар Лучанок, Юрый Семяняка, Уладзімір Кандрусевіч, Дзмітрый Смольскі).*
10. Хто з'яўляецца аўтарам і выканаўцамі песні "Алеся"? *(Аўтар слоў – Аркадзь Куляшоў, музыкі – Ігар Лучанок, выканаўцы – ансамбль "Сябры" – Анатоль Ярмоленка і Алеся).*

**7 станцыя - "Спартыўная"**

Фізічнай культуры і спорту, што сталі візітнай карткай нашай краіны на сусветнай арэне, надзяляецца вялікая ўвага. Пра гэта гавораць высокія дасягненні беларусаў на міжнародных спаборніцтвах, наяўнасць спартыўных збудаванняў сусветнага класа і таксама актыўная падтрымка здаровага ладу жыцця і спорту сярод жыхароў нашай краіны.

1. Назавіце зімовы від спорту, у якім беларускія спартсмены заваявалі медалі на Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы і Сочы. *(Фрыстайл, біятлон).*
2. Па якім відзе спорту ў 2014 годзе ў Мінску праходзіў Чэмпіянат свету? *(Хакей)*
3. Максім Мірны і Вікторыя Азаранка – самыя вядомыя… *(Тэнісісты).*
4. Беларуская біятланістка, алімпійская чэмпіёнка і чэмпіёнка свету, уладальніца Вялікага крыштальнага глобуса ў сезоне 2014-2015 гадоў. *(Дар'я Домрачава).*
5. Адзін з першых у гісторыі беларускага хакея, капітан нацыянальнай зборнай. Першым дайшоў да фіналу Кубка Стэнлі. *(Руслан Салей).*

6. Легендарная гімнастка, заваява ла чатыры залатыя алімпійскія медалі, тры з іх на Алімпійскіх гульнях у Мюнхене (1972 г.). Прызнана лепшай гімнасткай свету. *(Вольга Корбут).*
7. Беларускі спартсмен і трэнер, чэмпіён алімпійскіх гульняў. Прызнаны лепшым барцом вольнагастылю XX стагоддзя. *(Аляксандр Мядзведзь).*
8. Адзін з буйнейшых спартыўных комплексаў у краіне, даступны для ўсіх аматараў зімовых відаў спорту. *(Раўбічы).*
9. Беларускі гімнаст, чэмпіён XXV Алімпійскіх гульняў. Бронзавы прызёр XXVI Алімпійскіх гульняў, 14-разовы чэмпіён свету, 10-разовы чэмпіён Еўропы. Пераможца Гульняў добрай волі. Чэмпіён універсіяды. *(Віталь Шчэрба).*
10. Якія гульні пройдуць у Беларусі з 21 па 30 чэрвеня 2019 года? *(Другія Еўрапейскія гульні).*

**8 станцыя - “Святочная”**

Святы – сукупнасць звычаяў і абрадаў, якія ўзніклі яшчэ ў першабытным грамадстве. Былі звязаны з каляндарным (гуканне вясны, грамніцы) ці зямельным цыкламі. Падзяляюцца святы на рэлігійныя, сінкрэтычныя і безрэлігійныя. Рэлігійныя святы – царкоўныя, у прыватнасці хрысціянскія (Ражство Хрыстова). Сінкрэтычнымі святамі (мелі рэлігійныя і безрэлігійныя элементы) былі традыцыйныя каляндарныя народныя святы (Каляды, Масленіца, Купалле і інш.). Да безрэлігійнай часткі народных святаў належалі шматлікія гульні, асабліва на Каляды, Масленіцу, Купалле.

1. Гэта свята належыць да найбольш паэтычных святаў славянскіх народаў, свята сонца, святла, паўнаты сіл прыроды. Кожны год гэта свята збірае шмат гасцей у Александрыі. *(Купалле).*
2. Старажытнае свята земляробчага календара, прымеркаванае да часу выспявання садавіны і гародніны. Адзначаецца 19 жніўня. З'яўляецца мяжой паміж летнім і асеннім цыклам работ. *(Спас).*
3. З вялікай любоўю і пашанай беларускі народ ставіцца да збору ўраджаю. Цяжкая праца людзей звычайна заканчваецца гэтым абрадам. *(Дажынкі).*
4. Народнае зімовае свята ў гонар зімовага сонцастаяння, адзначаецца каталікамі з 24 снежня па 6 студзеня і праваслаўнымі з 6 студзеня па 19 студзеня. *(Каляды).*
5. Дзень сустрэчы зімы з летам, Свята Свечкі і “жывога агню”. Лічыцца, што ўжо могуць быць грымоты, навальніцы. *(Грамніцы).*
6. Вялікае гадавое веснавое свята. Гэтым святам некалі адкрываўся новы каляндарны год. Свята пачынаецца “ўсяночнай”. Лічыцца, што гэта земляробчае свята, у якім адно памірае, а другое нараджаецца. (*Вялікдзень*).
7. Сімвал Вялікадня – яйкі,пафарбаваныя ў чырвоны колер, сімвал Масленіцы – бліны. Што з'яўляецца сімвалам беларускага народнага свята “Зялёныя святкі” (“Сёмуха”)? *(Галінкі бярозы).*

8. Народнае свята глыбокай восені, пасля якога пачынаецца зіма. Усім вядома, што пасля гэтага свята зямля пакрываецца лісцем, а то і снегам, вада – лёдам. *(Пакровы).*
9. Гэта даўняе свята заканчэння зімы. На гэта свята абавязкова пякуць бліны, наладжваюць вясёлыя гульні і забавы. *(Масленіца).*
10. 22 сакавіка, у дзень восеньскага раўнадзенства, у Беларусі шырока адзначаюць народнае свята “Саракі”. Лічылася, што вялікі поспех чакае тых, хто першым убачыць у гэты дзень… каго? *(Клін жураўлёў або гусей).*

Вось і скончылася наша падарожжа па Беларусі. Спадзяемся, што яно было прыемным і цікавым.

Закончыць наша падарожжа хочацца словамі Пятруся Броўкі.

*Хіба можна кут не любіць,*
*Дзе твае нарадзілісь бацькі,*
*Дзе жыццё пражылі дзяды,*
*Дзе спрадвеку твае карані?*

Загадчык ІБЦ Бярозаўскай СШ № 3

Стукачова Галіна Балеславаўна

+375 29 9363673